# ПА-БРАЦКУ, ПА-СЯБРОЎСКУ, ПА-ПАРТНЁРСКУ

## Галоўнае пытанне адносін паміж Беларуссю і Расіяй — роўныя ўмовы

**Учора адбылася сустрэча Прэзідэнта з міністрам замежных спраў Расіі Сяргеем Лаўровым.**

У пачатку беларускі лідар адзначыў, што бакам ёсць пра што пагаварыць. «Хоць сакратэў у мяне ад Міністэрства замежных спраў Беларусі няма, і я думаю, ваш калега, карыстаючыся вашымі давернымі адносінамі, вельмі падрабязна расказаў вам пра сітуацыю ўнутры краіны, пра нашы памкненні. Вы чалавек дасведчаны і ўмееце чытаць паміж радкоў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт дадаў, што сёння з'яўляецца розная інфармацыя, «пішуць усякае», на што ён рэагуе некалькі хваравіта і не можа адвыкнуць ад гэтага за столькі гадоў. «Таму вось такая размова сам-насам, яна заўсёды карысная — гэта першае, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Другое: вы ведаеце, у нас быццам бы і нядрэнныя адносіны складваюцца ў цэлым з Расійскай Федэрацыяй, нават вельмі добрыя. Факт, што лепшыя, чым з іншымі дзяржавамі».

Ён звярнуў увагу, што паміж дзяржавамі існуе адно галоўнае пытанне, якое неабходна вырашыць. Яно, па словах беларускага лідара, абмяркоўваецца на самым высокім узроўні, яго абмяркоўваюць міністэрствы замежных спраў, прычым абмеркаванне пачалося яшчэ ў часы Барыса Ельцына. «Роўныя ўмовы для працы людзей, суб'ектаў гаспадарання ў нашай агульнай айчыне, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я так гэта называю, і інакш, напэўна, не назавеш. Калі ёсць такая розніца ў рабоце суб'ектаў гаспадарання ў парушэнне нашых дамоваў, якія існуюць, гэта дрэнна. Вось трэба вырашыць гэтае асноўнае пытанне, і я думаю, у нас ніколі не будзе прэтэнзій да Расіі, а ў Расіі — да нас».

Беларускі лідар таксама заўважыў, што калі ў Беларусі і Расіі гандлёвае сальда складваецца ў велізарны мінус, то нашай краіне даводзіцца шукаць дзесьці па ўсім свеце, каб закрыць гэты дысбаланс. Іншымі словамі, усё ідзе ад эканомікі.

«А так, увогуле, сітуацыя нядрэнная», — канстатаваў ён.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ставіць у прыклад работу Міністэрства абароны і Міністэрства замежных спраў, асабліва апошняга, паколькі ёсць поўнае разуменне, але ёсць і пытанні, пра якія трэба казаць «гледзячы адзін аднаму ў вочы».

Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў паведаміў пра сумеснае пасяджэнне калегіі Міністэрства замежных спраў Беларусі і калегіі Міністэрства замежных спраў Расіі, якое адбылося літаральна перад сустрэчай з кіраўніком дзяржавы.

«Мы лічым, што трэба цалкам выконваць дамоўленасці, якія былі, як у адносінах да гаспадарчых суб'ектаў, так і ў дачыненні да грамадзян. У нас многія рэчы ўжо вырашаны, але па асобных пытаннях патрэбна работа, і мы, як знешнепалітычнае ведамства, будзем усяляк спрыяць таму, каб адпаведныя структуры дзвюх краін дамаўляліся», — заявіў міністр замежных спраў Расіі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### ЧАКАЕМ РАШЭННЕ Ў СНЕЖНІ

Пагадненне аб узаемным прызнанні віз можа быць падпісана на саюзным Саўміне, расказаў журналістам міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў па выніках сустрэчы з кіраўніком дзяржавы.

Апошні раўнд перагавораў па дакуменце паміж Беларуссю і Расіяй аб гэтым адбудзецца літаральна некалькі дзён таму на ўзроўні дэлегацый. «Чарговай вяхой для выхаду на ўжо канчатковыя дамоўленасці будзе, па-мойму, канец лістапада — пачатак снежня, калі эксперты павінны чарговы раз ужо ў рамках сумеснай рабочай групы па пытаннях міграцыі правесці агляд пакінутых пытанняў, — сказаў ён. — Засталіся там, здаецца, тэхнічныя пытанні. Апошні раўнд зафіксаваў досыць сур'ёзны прагрэс. І на 13 снежня, калі мы плануем правядзенне саюзнага Савета Міністраў, мы разлічваем вынесці гэты праект пагаднення на падпісанне».

# ЧАС «ЗВЕРЫЦЬ ГАДЗІННІКІ»

## Беларусь была і ёсць выключна мірная дзяржава

**Аб гэтым заявіў журналістам міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір Макей, падводзячы вынікі сумеснага пасяджэння калегіі міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Расіі.**

Мерапрыемства — пляцоўка, каб «зверыць гадзіннікі» па выкліках на міжнароднай арэне і пытаннях супрацоўніцтва. На сустрэчы абмяркоўвалася партнёрства ў інтэграцыйных саюзах на Еўразійскай прасторы, СНД, АДКБ і структурах АБСЕ, ААН. Таксама ў фокусе — праблема міжнароднай бяспекі.

Адзначыў Уладзімір Макей асаблівую інтэнсіўнасць дыялогу на вышэйшым і высокім узроўнях у бягучым годзе. Міністр замежных спраў звярнуў увагу, што традыцыйна сустрэчы з расійскімі калегамі праходзяць у «цёплай, сяброўскай атмасферы».

Не зняты да канца з двухбаковага парадку дня пытанні эканамічнага кшталту — урэгуляванне сітуацыі, звязанай з падатковым манеўрам і нафтаздабычай. Яны напрамую ўплываюць на баланс у тавараабароце — беларускі экспарт за дзевяць месяцаў гэтага года вырас усяго толькі на 0,6 %, а імпарт — на 22 %.

«Мы ўчора ў фармаце адзін на адзін з Сяргеем Віктаравічам (Лаўровым. — **Аўт.**) абмеркавалі шэраг пытанняў міжнароднага парадку дня, двухбаковых адносін, сітуацыю ў рэгіёне», — сказаў Уладзімір Макей, адзначыўшы, што перагаворы з расійскім калегам не абышліся толькі сумесным пасяджэннем калегій.

Сяргей Лаўроў у сваю чаргу ацаніў, што апошнім часам Беларусь стала пляцоўкай шэрагу міжнародных сустрэч — пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, групы высокага ўзроўню пад старшынством намеснікаў прэм'ер-міністраў і Форуму рэгіёнаў. Сустрэча прайшла напярэдадні значнай падзеі — пасяджэння Саўміна Саюзнай дзяржавы.

Па словах Сяргея Лаўрова, на ім «будуць прыняты вельмі важныя рашэнні, якія ўмацоўваюць нашу інтэграцыю».

«Мы даём станоўчую адзнаку і інтэграцыйнаму супрацоўніцтву ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, дамовіліся працягваць садзейнічаць пашырэнню і ўмацаванню знешніх сувязяў ЕАЭС у тым ліку з Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва, з краінамі АСЕАН, з Кітайскай Народнай Рэспублікай у рамках злучэння еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў з кітайскай праграмай «Адзін пояс — адзін шлях», — паведаміў Сяргей Лаўроў.

Працідзеянне фальсіфікацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, перагляду яе вынікаў, недапушчальнасць гераізацыі фашыстаў, па словах міністраў, таксама стала адной з найважнейшых тэм сустрэчы. Гэтыя ідэі будуць рэалізоўвацца ў рамках умацавання сумеснай культурна-гістарычнай прасторы.

І канешне, увага дзвюх краін будзе скіравана на міжнародную бяспеку ва ўсіх яе вымярэннях, у тым ліку ў кібер- і інфармацыйнай прасторы. Міністры выказалі заклапочанасць у сувязі з узмацненнем ваеннай актыўнасці НАТА каля нашых межаў, а таксама з намерам Вашынгтона выйсці з Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. Гэта выклікі як для Саюзнай дзяржавы, так і для АДКБ.

Па выніках сустрэчы кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў падпісалі пастанову калегіі і план кансультацый МЗС на 2019 год.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ДАРОГА ПЕРАМЕН

## Настае новы этап адносін Беларусі і Еўрапейскага інвестыцыйнага банка

**Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам Еўрапейскага інвестыцыйнага банка Аляксандрам Стубам.**

Па словах кіраўніка дзяржавы, сёння і Еўропа, і ўвесь заходні свет пераканаліся ў тым, што з Беларуссю можна мець справу, што наша краіна — гэта надзейны партнёр, асабліва ў сферы гандлёва-эканамічных, фінансавых адносін. «Ваш візіт сёння і падпісанне ў яго рамках пагадненняў з вашым банкам аб інвеставанні — вельмі важным кірунку развіцця нашай краіны — сведчыць аб тым, што мы пераадолелі ўсякае неразуменне і выходзім на новы этап супрацоўніцтва», — адзначыў Прэзідэнт.

«Мы сёння працуем з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам над крэдытамі на суму каля паўмільярда еўра», — сказаў ён. У Беларусі вельмі старанна адбіраюць праекты для інвеставання, і тое, што Еўрапейскі інвестыцыйны банк дапамагае ініцыятывам, звязаным з людзьмі, жыллём, забеспячэннем вадой, інфраструктурай, дарогамі, вельмі важна для нашай дзяржавы, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Мы будзем надзейнымі партнёрамі ў гэтым плане», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, Прэзідэнт агучыў асабістую просьбу: ён назваў Аляксандра Стуба эфектыўным фінансавым менеджарам, за спінай у якога велізарны досвед на яго радзіме, у Фінляндыі, дзе ў розны час ён займаў высокія дзяржаўныя пасады. «Я вас вельмі папрасіў бы — я дам заданне Міністэрству замежных спраў у гэтым плане яшчэ папрацаваць з беларускага боку — дапамагчы нам усталяваць цесныя адносіны з Фінляндыяй», — сказаў Прэзідэнт.

У Беларусі ў вялікай ступені такая ж структура эканомікі, як у гэтай краіне, таму беларускі бок хацеў бы, каб супрацоўніцтва было на тэхналагічным узроўні. Дапусцім, лес і перапрацоўка драўніны. На думку беларускага лідара, так, як Фінляндыя, у свеце не працуе ніхто па гэтых кірунках. «Калі вы нам дапаможаце, я буду вам вельмі ўдзячны», — дадаў Прэзідэнт.

У адказ Аляксандр Стуб адзначыў «тую выдатную работу, якую мы прарабілі разам з Беларуссю па праектах, дакументы па якіх мы падпісалі ўчора з прэм'ер-міністрам з вашага дазволу. І гэта сапраўды вельмі важныя праекты, адзін з іх звязаны з ачышчальнымі збудаваннямі, іншы — з малымі і сярэднімі прадпрыемствамі».

Нагадаем, напярэдадні Еўрапейскі інвестыцыйны банк падпісаў з Беларуссю пагадненні на суму 160 мільёнаў еўра. Грошы пойдуць на рэканструкцыю Мінскай ачышчальнай станцыі, а таксама на падтрымку малога і сярэдняга бізнесу.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### НАПЕРАДЗЕ ЯШЧЭ ШМАТ ПРАЕКТАЎ

ЕІБ плануе ў 2019 годзе інвеставаць у Беларусь 260 мільёнаў еўра — аб гэтым па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам расказаў журналістам віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага інвестыцыйнага банка. На яго думку, праекты, на якія пойдуць грошы паводле падпісаных пагадненняў, выгадныя і добрыя не толькі для ЕІБ, але і для беларускага народа.

«Мы таксама абмяркоўвалі нашы будучыя праекты, напрыклад рэканструкцыю трасы М7, энергетыку, супрацоўніцтва ў сферы муніцыпальных паслуг і іншыя канкрэтныя дэталі. Я чакаю плённага, карыснага ўзаемадзеяння ў будучыні паміж Беларуссю і нашым банкам», — дадаў ён.

«У нас ёсць некаторыя планы на будучыню, напрыклад налета мы плануем інвестыцыі ў памеры 260 мільёнаў еўра. Гэта значыць, вы можаце ўбачыць, што ў сярэднім у год памер інвестыцый будзе складаць да 200 мільёнаў, — звярнуў увагу Аляксандр Стуб. — І самае важнае, што гэта прыклад канкрэтнай работы, якую ЕС можа праводзіць для таго, каб дапамагаць сваім партнёрам, наладжваць добрыя адносіны».

Другі момант, які абмяркоўваўся на сустрэчы, — гэта сусветная палітыка. «Прыйшлося ўспомніць пра старое жыццё, пра восем гадоў у фінскім урадзе, — адзначыў ён. — І той аналіз, нашы думкі аб палітычнай сітуацыі ў свеце, аказаліся вельмі падобныя. Мы абмяркоўвалі брэксіт, расстаноўку сіл і баланс паміж такімі ключавымі гульцамі, як ЗША, Расія, Кітай, і многія іншыя рэчы». Па словах Аляксандра Стуба, шмат у чым пазіцыі сапраўды былі вельмі падобныя, паколькі Фінляндыя, як і Беларусь, мае даволі працяглую мяжу з Расіяй.

## Цікавы досвед

# «КАЛІДОРНЫЯ ДЗЕЦІ» БОЛЬШ НЕ БЕГАЮЦЬ ПА КАЛІДОРАХ

**Не ўсе сем'і, асабліва маладыя, маюць уласнае жыллё. Некаторыя здымаюць кватэру, хтосьці жыве ў інтэрнаце. У дзяцей, чый дом — сямейны інтэрнат, месцам для гульняў, як правіла, становіцца калідор. Пагадзіцеся, не самая прыстасаваная для гэтага прастора. Ды і канфлікты з суседзямі, якім не падабаюцца шум і дзіцячыя крыкі, пры гэтым не рэдкасць.**

Таму і ўзнікла ідэя адкрыць у інтэрнатах пакоі, прыстасаваныя для дзіцячага вольнага часу. Праект «Калідорныя дзеці» дазваляе вырашыць гэтыя праблемы.

Быццам бы такая простая думка, але дзякуючы праекту, які нарадзіўся з яе, «калідорныя дзеці» ў некалькіх інтэрнатах краіны ўжо не бегаюць па калідорах, а займаюцца ў спецыяльна абсталяваным пакоі, дзе ёсць умовы як для рухомых, так і для інтэлектуальных гульняў, для хобі і стасункаў.

Праект падтрымалі гарадскія ўлады і аб'яднанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. На Міншчыне ён рэалізуецца ў Жодзіне і Маладзечне і быў у ліку іншых прадстаўлены на абласным міжведамасным семінары па пытаннях рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у праблемных сем'ях», які адбыўся 20 лістапада ў Маладзечне.

Акрамя гэтага, удзельнікі міжведамаснага семінара — прадстаўнікі праваахоўных органаў, камісій па справах непаўналетніх гаррайвыканкамаў, супрацоўнікі аддзелаў адукацыі, ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, медыкі і іншыя абмяркоўвалі актуальныя пытанні па абароне правоў дзяцінства і абмяняліся вопытам сваёй работы.

**Святлана БУСЬКО.**